ПРОЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЕДНАЙЦЕСЯ!

ПРАЧЫТАЎ, ПЕРАДАЙ ДРУГОМУ.

# ВІЦЕБСКІ РАБОЧЫ

ОРГАН ВІЦЕБСКАГА АБЛАСНОГА І ГАРАДСКОГА КАМІТЭТАЎ КП(б)Б, АБЛАСНОГА І ГАРАДСКОГА СОВЕТАЎ ДЭПУТАТАЎ ПРАЦОЎНЫХ

№ 7 (7084) | Серада, 26 студзеня | 1944 г.

*Няхай жыве ленінізм, наш верны, выпрабаваны ў баях сцяг, пад якім мы перамагалі і будзем перамагаць!*

*Няхай жыве вялікі Сталін, які вядзе нас да канчатковай перамогі!*

## ЗАГАД

### Вярхоўнага Галоўнакамандуючага

### Генералу арміі ГОВАРАВУ

Войскі Ленінградскага фронта, прадаўжаючы паспяховае наступленне, сёння, 24 студзеня, у выніку ўмелага абходнага манёўра і імклівай атакі з фронта, авалодалі горадам Пушкін (Царскае сяло) і горадам Паўлаўск (Слуцк)—буйнымі чыгуначнымі вузламі і магутнымі апорнымі пунктамі абароны немцаў.

У баях за авалоданне гарадамі Пушкін і Паўлаўск вызначыліся войскі генерал-палкоўніка Масленікава, генерал-маёра Хазава, генерал-маёра Бунькова, генерал-маёра Ястрабава, палкоўніка Введзенскага, артылерысты генерал-маёра артылерыі Міхалкіна, палкоўніка Маслоўскага і танкісты падпалкоўніка Грдзелішвілі.

У азнаменаванне атрыманай перамогі найбольш вызначыўшыеся ў баях злучэнні і часці прадставіць да прысваення найменаванняў „Пушкінскіх“ і „Паўлаўскіх“ і да ўзнагароды ордэнамі.

Сёння, 24 студзеня, у 21 гадзіну сталіца нашай Радзімы Масква ад імені Радзімы салютуе нашым доблесным войскам, авалодаўшым гарадамі Пушкін і Паўлаўск,—дванаццацю артылерыйскімі залпамі са ста дваццаці чатырох гармат.

За выдатныя баявыя дзеянні аб'яўляю падзяку ўсім кіруемым Вамі войскам, удзельнічаўшым у баях за вызваленне гарадоў Пушкін і Паўлаўск.

Вечная слава героям, паўшым у барацьбе за свабоду і незалежнасць нашай Радзімы!

Смерць нямецкім захватчыкам!

**Вярхоўны Галоўнакамандуючы**
**Маршал Совецкага Саюза**

**І. СТАЛІН.**

24 студзеня 1944 года.

## Па-баявому рыхтавацца да веснавой сяўбы

Нямецкія каты разбурылі і нанеслі незлічоную шкоду сельскай гаспадарцы нашай вобласці. Патрабуецца велізарнейшае напружанне ўсіх сіл, каб аднавіць усё разбуранае.

Веснавая сяўба — гэта адказны этап у сельскагаспадарчым годзе. Вось чаму падрыхтоўка да яе павінна весціся па-баявому, поўным ходам ва ўсіх вызваленых калгасах, соўгасах і машынатрактарных станцыях.

Вядома, што насенне з'яўляецца асновай павышэння ўраджайнасці. Таму ў вызваленых калгасах неабходна хутка закончыць стварэнне насенна-страхавых фондаў. Ужо ёсць нямала прыкладаў гаспадарскіх клопатаў аб насенні. Па даных Абалза, пяршынства ў вобласці па засыпцы насення займаюць Лёзненскі і Сіроцінскі раёны, дзе засыпана, у Лёзненскім—зерневых 1735 цэнтнераў і бульбы 3613 цэнтнераў, у Сіроцінскім—зерневых 378 цэнтнераў і бульбы—1200 цэнтнераў.

Выключна вялікія задачы ўскладаюцца на аднаўляемыя МТС у правядзенні веснавой сяўбы. Гэта абавязвае кіраўнікоў раёнаў і МТС у многа раз узмацніць увагу да аднаўлення машына-трактарных станцый і рамонту трактараў. Правільная арганізацыя працы—важнейшая ўмова паспяховага правядзення рамонтнай кампаніі.

Трэба яшчэ шырэй раздуць полымя соцыялістычнага спаборніцтва ў аднаўляемых МТС і МТМ, мабілізаваць усіх рамонтнікаў на поўнае выкананне плана рамонту трактараў у кароткі тэрмін і добраякасна, стварыць ім неабходныя ўмовы для работы. Неаслабнай павінна быць увага да падрыхтоўкі трактарыстаў і другіх механізатарскіх кадраў.

Задача кіраўнікоў раёнаў і МТС, зямельных органаў, калгасаў і ўсіх калгаснікаў весці ўсе падрыхтоўчыя работы да веснавой сяўбы рытмічна і паспяхова. Будзем працаваць так, каб сустрэць веснавую сяўбу ва ўсеўзбраенні.

## Урачыста-траурнае пасяджэнне, прысвечанае 20 гадавіне з дня смерці В. І. Леніна

21 студзеня ў Маскве, у Вялікім зале Крэмлёўскага палаца адбылося ўрачыста-траурнае пасяджэнне ЦК ВКП(б), Маскоўскага абласнога і Маскоўскага гарадского Камітэтаў ВКП (б), Прэзідыумаў Вярхоўнага Совета СССР і Вярхоўнага Совета РСФСР, Маскоўскага абласнога і гарадскога Советаў дэпутатаў працоўных, ЦК ВЛКСМ, МК і МГК ВЛКСМ, Прэзідыума ВЦСПС, разам з прадстаўнікамі партыйных, грамадскіх арганізацый і Чырвонай Арміі, прысвечанае 20 гадавіне з дня смерці В. І. Леніна.

У 6 гадзін 50 мінут за сталом прэзідыума паяўляюцца таварышы Сталін, Молатаў, Калінін, Кагановіч, Андрэеў, Мікаян, Берыя, Швернік, Маленкоў, Шчэрбакоў, Вазнесенскі. Удзельнікі ўрачыста-траурнага пасяджэння сустракаюць іх бурнай авацыяй.

— Няхай жыве таварыш Сталін!

У глыбокім і моцным душэўным парыве ўсе ўстаюць, вітаючы таварыша Сталіна і яго саратнікаў і ў іх асобе—партыю Леніна—Сталіна, баявога арганізатара і натхніцеля перамог над нямецка-фашысцкімі захватчыкамі. Грыміць магутнае „Ура“, у адно зліваюцца незмаўкаючыя апладысменты і воклічы ўрачыстых прывітанняў.

Тав. М. І. Калінін аб'яўляе ўрачыста-траурнае пасяджэнне адкрытым.

— Сёння споўнілася 20 год з дня смерці Владзіміра Ільіча Леніна,—гаворыць таварыш Калінін.—Прашу ўшанаваць яго памяць устаннем.

Усе ўстаюць. Урачыста і напоўнена глыбокай значымасці гэта мінута маўчання! Зрокі ўсіх звернуты да таварыша Сталіна. Да яго, вялікага прадаўжальніка справы Леніна, які высока нясе пабеданосны, асяняючы совецкі народ ленінскі сцяг, звернута сыноўняя любоў і ўдзячнасць народа.

М. І. Калінін прадастаўляе слова для даклада тав. А. С. Шчэрбакову. Удзельнікі пасяджэння цёпла сустракаюць яго доўга незмаўкаючымі апладысментамі.

Яркі, глыбоказмястоўны даклад таварыша Шчэрбакова выслухоўваецца з велізарнай і ўсхваляванай увагай.

Дакладчык падводзіць вынік 20 год барацьбы за ажыццяўленне ленінскіх ідэй, якую паслядоўна і напружана вяла большэвіцкая партыя пад кіраўніцтвам таварыша Сталіна. Гэты вынік падводзіцца ў абстаноўцы нарастаючага пабеданоснага наступлення Чырвонай Арміі, знамянуючага сабой таржаство ленінска-сталінскіх ідэй.

З вялікай увагай выслухоўваецца заява таварыша Шчэрбакова аб крушэнні гітлераўскіх планаў, разлічаных на раскол дэмакратычнай кааліцыі, аб умацаванні давер'я і адзінства сярод краін антыгітлераўскай кааліцыі. Гэту заяву ўсе прысутныя ўспрымаюць з вялікім задаволеннем.

Заканчваючы даклад, таварыш Шчэрбакоў папярэджвае супроць настрояў самасупакаення і зазнайства і заклікае мабілізаваць усе сілы народа, усю магутнасць і майстэрства нашай арміі, каб дабіць фашысцкіх захватчыкаў. З новай сілай гучыць прыведзенае дакладчыкам указанне таварыша Сталіна аб тым, што перамога не даецца без барацьбы і напружання, што яна бярэцца з бою.

Бурныя апладысменты, воклічы прывітанняў зліваюцца ў адзіную магутную дэманстрацыю любві і адданасці нашага народа вялікаму Сталіну. Удзельнікі пасяджэння, стоячы спяваюць партыйны гімн „Інтэрнацыянал“.

Тав. М. І. Калінін аб'яўляе ўрачыста-траурнае пасяджэнне закрытым.

## *Ад Совецкага Інформбюро*

### З аператыўнай зводкі за 24 студзеня

Войскі Ленінградскага фронта, прадаўжаючы паспяховае наступленне, 24 студзеня авалодалі горадам Пушкін (Царскае сяло), горадам Паўлаўск (Слуцк), а таксама з баямі занялі больш 40 другіх населёных пунктаў і сярод іх Новае Ермоліна, Старае Ермоліна, Смалькова, Воханава, Сокалава, Раманаўка, Горкі, Пакроўскае, Гукалава, Папова. Нашы войскі перарэзалі чыгунку Гатчына—Нарва.

На працягу 24 студзеня на паўночны-захад ад Тосно нашы войскі з баямі прасоўваліся ўперад і занялі некалькі пунктаў, сярод іх буйны насялёны пункт Ульянаўка, пераўтвораны немцамі ў моцны вузел абароны, і чыгуначны вузел Сабліна на чыгуначнай магістралі Ленінград—Масква.

На захад і на паўднёвы-захад ад Ноўгарада нашы войскі вялі наступальныя бai, у ходзе якіх занялі насялёныя пункты Багданава, Сцехава, Сутокі, Ларэшнікава, Орлова, Сідаркова, Бальшое і Малае Падсонне, Сельцо, Вярхоўе, Спаспіскапец, Гарошкава, Забалоцце, Курыцко, Сергава і чыгуначныя станцыі Трасова, Барок.

На ўсход ад Вінніцы нашы войскі адбівалі атакі буйных сіл пяхоты і танкаў праціўніка і нанеслі яму вялікія страты ў жывой сіле і тэхніцы.

На другіх участках фронта, у радзе пунктаў ішлі бai мясцовага значэння.

На працягу 23 студзеня нашы войскі на ўсіх фронтах падбілі і знішчылі 46 нямецкіх танкаў. У баях і агнём зенітнай артылерыі збіта 45 самалётаў праціўніка.

